# Арфаграфія

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

## Правапіс галосных пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных

**Пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных галосныя *о, э* пішуцца пад націскам:**
*восень, вокны, сонца, сэрца*

**Не пад націскам *о, э* змяняюцца на *а* :**
*дровы – драўляны, цэгла – цагляны, жолуд – жалуды, рэдкі – радзей, чорны - чарніцы*

**У запазычаных словах ненаціскны *[э]* захоўваецца:**
*экзамен, тэлевізар, рэцэпт, відэамагнітафон, аэробіка, аэрапорт*

**На канцы некаторых іншамоўных слоў пасля галосных захоўваецца ненаціскны *[о]*:**
*Антоніо, Ватэрлоо, ТОкіо, капрычыо, трыо, сальфеджыо*

**Правапіс галосных пасля мяккіх зычных**

Пасля мяккіх зычных у першым сказе перад націскам замест *е, ё* пішацца **я**:

*звесці – зьяду, мёд – мядок, вечар - вячоркі*

У астатніх складах асновы перад націскам і пасля яго *е* захоўваецца:

*вецер, векавечны, велікаваты, зеленаваты, вясёленькі*

У словах іншамоўнага паходжання *е* захоўваецца:

*тэлефон, дэлегат, мелодыя, перон*

**Е** захоўваецца у словах *дзевяты, дзесяты, семнадцаць, васемнадцаць* і ўтвораных ад іх

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

# Правапіс галосных пасля мяккіх зычных

**Спрадвечны гук *[а]* пасля мяккіх зычных вымаўляецца нязменна ва ўсіх складах, таму перадаецца на пісьме літарай *я* незалежна ад месца націску:**

***ядавіты***
***цягавіты***
***цягнікі***
***лямантаваць***

***цяжкаваты***
***мяккаваты***
***сляткаванне***
***выцягнуць***

***сувязь***
***погляд***
***сеяць***
***веяць***

**Правапіс такіх слоў трэба запомніць**

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

## Правапіс й

Літарай *й* абазначаецца на пісьме гук *[й]* пасля галосных на канцы сказа:

- *най-ме-нне, зай-сці,*
- *пе-рай-граць*

У астатніх выпадках гук *[й]* разам з галоснымі абазначаецца літарай *і* :

- пасля галосных:
- *пе-ра-і-гры-ваць*
- пасля апострафа:
- *на ўзмор'-і*
- пасля мяккага знака:
- *І-льі*
- пасля ў:
- *на зі-моў-і*

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

# Правапіс ў, у

Літара ў (у нескладовае) пішацца пасля галосных:

*пра ўдзел, на ўзмежак, коўш, здароўе*

Літара у пішацца пасля зычных і знакаў прыпынку:

*Улетку шэранькі, узімку беленькі…*

*“Так было…” – уздыхнуў Санкоўскі… (П. Пестрак)*

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА

К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

**У іншамоўных словах *пасля галосных***

**пішацца зычны ў у сярэдзіне слоў:**
***паўза, маўзер, аўдыторыя, маўзалей, браўнінг, іхтыязаўр***

**пішацца галосны у**

**у пачатку слоў:**
***ва універсаме, да універмага,***
***пра унікальнасць***

**у канцоўках -ул, -ум, -ут, -ус, -уз, -ун, -умф, -унд,**
**дзе у, як правіла, утварае склад:**
***аул, Барнаул, саксаул, сімпозіум, шлагбаум, акварыум, соус, архіварыус, Сірыус, лакаут, алеут, раут (але: накаўт), пакгауз, цэйхгауз, клоун, трыумф, раунд і інш.***

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

# Зычныя гукі

Перад галоснымі зычныя гукі заўсёды ў моцнай пазіцыі, іх вымаўленне адпавядае напісанню:

*стагі, грабуць, кладачка, лёгенька, каледжы*

Перад зычнымі і на канцы слоў зычныя гукі (акрамя санорных) знаходзяцца ў слабай пазіцыі, іх вымаўленне не адпавядае напісанню:

парныя звонкія на канцы слоў і перад зычнымі аглушаюцца:

*стог – сто[х], грэбці – грэ[п]ці, кладка – кла[т]ка, медзь – ме[ц]ь, лёгкі – лё[х]кі*

парныя глухія перад звонкімі азванчаюцца:

*касьба – ка[з']ба, футбол – фу[д]бол, носьбіт – но[з']біт, лічба – лі[дж]ба*

Каб не памыліцца ў напісанні, у большасці выпадкаў можна падабраць праверачнае слова з галосным пасля зычнага:

*стог – стагі, касьба – касіць, малацьба – малаціць, барацьба - барацы*

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

# Правапіс мяккага знака

**Мяккасць зычных абазначаецца на пісьме літарамі *е, ё, ю, я, і, ь***

**Мяккі знак пішацца**
**пасля мяккіх зычных:**

**на канцы слоў:**
***стол******ь******, лос******ь******, ален******ь******, мец******ь******, лез******ь******, знаходз******ь***

**у сярэдзіне перад цвёрдымі зычнымі, а пасля [л’], [н’] – і перад цвёрдымі, і перад мяккімі:**
***вольны, пісьмовы, ельнік, яблынькі***

**у сярэдзіне перад мяккімі зычнымі, калі пры змене слова ці падборы аднакаранёвага наступны мяккі змяняецца на цвёрды:**
***пісьменнік – пісьмо, бацькі – бацька, возьме – возьмуць, дзядзькі - дзядзька***

**Мяккі знак не пішацца пасля мяккіх свісцячых *[з’], [с’], [дз’], [ц’]* перад мяккімі зычнымі, калі пры змене слова ці падборы аднакаранёвага наступны мяккі зычны не становіцца цвёрдым:**
*у[с’]мешка – усмешка (смех, смешна, смяяцца, усміхацца – [м’] не становіцца цвёрдым; [дз’]ве – дзве (дзвюма, удзвюх – [в’] застаецца мяккім, а ў словах два, абодва змяніліся на цвёрды абодва мяккія зычныя*

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

Для абазначэння на пісьме раздзельнага вымаўлення зычнага з наступнымі галоснымі
*і, е, ё, ю, я* ўжываюцца **апостраф**
і **мяккі знак**

**Апостраф пішацца**

- *пасля цвёрдых зычных перад і[йі], е[йэ], ё[йо], ю[йу], я[йа] пры раздзельным іх вымаўленні:*
- *пад'есці*
- *кап'ё*
- *камп'ютэр*
- *бур'ян*
- *сузор'і*

**Апостраф не пішацца**

- *пасля ў:*
- *здароўе*

**Раздзяляльны мяккі знак пішацца**

- *пасля мяккіх зычных перад і[йі], е[йэ], ё[йо], ю[йу], я[йа] пры раздзельным іх вымаўленні:*
- *кампаньён*
- *ласьён*
- *парцье*
- *грыльяж*
- *мільянер*

# Правапіс спалучэнняў
# іё, (ыё), ія (ыя), іе (ые)

**Пад націскам**

**іё (ыё)**
*чэмпіён*
*патрыёт*

**Не пад націскам**

**ія (ыя)**
*біялогія*
*стацыянар*

**Незалежна ад націску**

**ія (ыя)**
*алімпіяда*
*дыяфільм*

**Нязменна**

**іе (ые)**
*гігіена*
*арыенцір*

**Пад націскам і ў пачатку слова**

**ё**
*маёр*
*ёг, ёгурт*

**Не пад націскам**

**я**
*маянэз*
*маярат*

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

**Правапіс**
**[д] – [дз’], [т] – [ц’]**

**Цвёрдыя *[д]* і *[т]* перад галоснымі**
***е, ё, ю, я, і,***
**перад мяккім *в* і *ь***
**змяняюцца на мяккія *[дз’]* і *[ц’]***

***буду – будзе, балота – забалаць, пяты – пяць, мяту – замець, двухсот – дзвесце, абодва - абедзве***

**У многіх запазычаных словах зычныя *д, т* не змякчаюцца:**
***дыскатэка, дызель, дэталь, тэрмас, тэлескоп, кратэр, фантастыка, атэстат, дынаміт, тэрмометр***

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

**Правапіс падоўжаных зычных**
**[з'], [с'], [дз'], [ц'], [л'], [н'], [ж], [ч], [ш]**

**Падаўжэнне зычных на пісьме перадаецца падвойным напісаннем літар:**
***палоззе, паднябессе, разводдзе, веццe, галлё, маляванне, бездарожжа, ноччу, заціішша***

**У запазычаных словах падвойныя літары не пішуцца:**
***маса, каса, тона, камунар, група, тэлеграма, клас, калона, метал, алея і інш.***
***Выключэнне: ванна, Жанна, манна, мадонна, мецца-сапрана***

**Трэба адрозніваць падаўжэнне зычных ад марфалагічнага падваення, якое адбываецца на стыку марфем, калі побач апынуцца аднолькавыя гукі:**
***аддаць, дацца, мяккі, карэнны, каменны – падваенне***
***але: смецце, пяцігоддзе, карэнне, каменне – падаўжэнне***

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

# Правапіс прыстаўных гукаў
***в, г, а, і***

**Прыстаўныя галосныя а, і**

- паяўляюцца ў некаторых словах перад збегам зычных, першы з якіх *р, л, м*:
  - *аржаны, амшэлы, іржа, ільсніца*

**Прыстаўное *г* пішацца**

- ў словах:
  - *гэй, гэты, Ганна, гармата і ўтвораныя ад іх*

**Прыстаўное в пішацца**

- перад націскным о ў пачатку слоў і пасля прыставак:
  - *воспа, ніводны, водгулле, ворыва*
- перад карэнным націскным і ненаціскным у:
- *вуда, вулей, вудзільна, вужака, вужовы*

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

**Прыстаўное в не пішацца**

- у беларускіх словах:
- перад ў, якое развілося з в:
- *улада, успамін, ускапаць, успыхнуць*
- перад былым прыставачным у:
- *участак, ураджай, указ*

**Прыстаўное в не пішацца**

- ў словах іншамоўнага паходжання, небеларускіх імёнах, прозвішчах, у геаграфічных назвах:
- *ордэн, ордэр, урна, Уолт Уітмен, Герберт Уэлс, Ожагаў, г.Уфа, г. Осла, г.Урэчча*

**Прыстаўное в не пішацца**

- калі о чаргуецца з а:
- *вольха – альховы, возера - азёры*
- Выключэнне:
- *вачэй, вачаняты, вастрыць, ваколіца і ўтвораныя ад іх*

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ